ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ, ВЯЧЭРА Ў ПАНІ ПЫШКІ, ХАДЖЭННЕ ПА ВАДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Шпарка пачаў развівацца прамысловы турызм. Як падчас адкрыцця турыстычнай выставы «Прафтур-2018» заўважыў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Міхаіл ОРДА,** сёння экскурсіі на разнастайныя прадпрыемствы дазваляюць падаваць людзям цікавую інфармацыю, пазіцыянаваць нашу вытворчасць, а таксама выконваюць прафарыентацыйную функцыю для школьнікаў. Паглядзець, як ствараецца магутная тэхніка, адзенне і абутак, пакаштаваць ласункі на кандытарскіх фабрыках, патрапіць на самы буйны ў свеце завод па вытворчасці алмазаў, даведацца, як варыцца піва і ствараюцца льняныя тканіны, выдзьмуваецца шкло, патрымаць у руках злітак толькі што адлітага золата на ювелірным заводзе — усё гэта стала магчыма дзякуючы новаму трэнду ў турыстычнай галіне.

— Мы і раней займаліся вытворчым турызмам, але сёлета істотна ўзмацнілі гэты кірунак і прапануем экскурсіі больш чым на 50 найбуйнейшых прадпрыемстваў Беларусі, — паведаміла **начальнік упраўлення турысцка-экскурсійнай работы і турыстычных паслуг кампаніі «Беларустурыст» Наталля ШЧАПАЛКІНА.** — Навінкі сезона — экскурсія на ювелірны завод «ZORKA», на смеццеперапрацоўчыя заводы ў Брэсце і Гродне. Сярод прадпрыемстваў, якія могуць наведаць турысты, — Тураўскі малочны камбінат, «Гомсельмаш» і Мінскі аўтамабільны завод, трыкатажныя фабрыкі, вытворчасць цацак маркі «Палессе». А яшчэ мы водзім экскурсіі за кулісы цырка, Мінскага тэатра оперы і балета і Гродзенскага тэатра.

Арганізатар анімацыйнай праграмы Аляксандр МЕЛЬНІКАЎ запрашае на «Парсюк-шоу».

Трэба сказаць, што калі раней «Беларустурыст» у асноўным прапаноўваў адпачынак унутры краіны, сёння ён запрашае турыстаў да мора ў Затоку, што недалёка ад Адэсы.

— Мы адкрываем дарогу да мора, прычым не толькі з Мінска ці Брэста, але і з самых маленькіх гарадоў нашай краіны. Аўтобусы паедуць на поўдзень Украіны ў Адэскую вобласць, — паведаміла **генеральны дырэктар прадпрыемства Людміла СЯНЬКОЎСКАЯ.** — А для замежных гасцей мы распрацавалі ўнікальную карту, якая называецца «Беларусь: крок за крокам» і куды нанесены 18 маршрутаў. Выкарыстоўваючы яе, турыст можа сам спланаваць сваё падарожжа: напрыклад, пачаць яго з аднаго маршруту, пасля даехаць да пэўнага гарадка і змяніць напрамак.

Паверце, сёння турызм ужо можна выбіраць на смак, колер і нават водар.

Сёлета прапануецца цудоўны набор тураў выхаднога дня, прычым не трэба чакаць лета, каб трапіць у падобнае падарожжа. Можна выправіцца па ўражанні ўжо ў наступную суботу. Звярніце ўвагу на навінкі — інтэрактыўныя экскурсіі ў Магілёве і Гомелі — гэта сапраўднае падарожжа ў часе і прасторы, вы трапіце на старажытны баль, будзеце вывучаць мову веера і кветак.

У падарожжах турысты не проста назіраюць за разнастайнымі касцюміраванымі шоу, але і самі становяцца актыўнымі ўдзельнікамі. Напрыклад, дом адпачынку «Лагойскі» прапануе вечар у казацкім стане, дзе можна навучыцца карыстацца шашкай, у Оршы турысты патрымаюць у руках сярэднявечную зброю, а на Браслаўшчыне іх задзейнічаюць у квэсце «Востраў скарбаў». А чаму не паўдзельнічаць у дранік-фэсце ці не павучыцца варыць сапраўдную юшку? Дарэчы, калі вы неабыякавыя да «гастранамічных» падарожжаў, звярніце ўвагу на новую анімацыйную экскурсію «У гасцях у пані Пышкі» на базе турысцка-аздараўленчага комплексу, што знаходзіцца за чатыры кіламетры ад Гродна. Між іншым, менавіта тут вас навучаць рабіць пышную бабку.

Фірмовыя каўбаскі, крывянкі і вантрабянкі можна пакаштаваць не на адной экскурсіі. Калі ж я паспрабавала выведаць хоць які-небудзь рэцэпт у **загадчыцы вытворчасці турбазы «Лясное возера» Яніны ЯНУШКІ,** жанчына пажартавала: «Усё трымаем у сакрэце, але абавязкова прыязджайце да нас, каб паласавацца такімі прадуктамі, якія не купіш ні ў адной краме. Усё робім уласнымі рукамі: самі сала солім, паляндвіцу сушым, морсы з брусніцаў і марошкі гатуем». Прынамсі, на гэтую базу трэба завітаць яшчэ і для таго, каб пазнаёміцца з паляўнічымі традыцыямі, у час анімацыйнай праграмы «Парсюк-шоу» турысты ў тым ліку ўдзельнічаюць у майстар-класе па разбіранні свежыны.

Патрапіць на вячэру ў сярэднявечным антуражы, пакаштаваць знакамітую аршанскую шпанку (моцны напой на зёлках) можна на адной з найстарэйшых беларускіх турысцка-аздараўленчых баз «Орша». Штогод тут прапануюць разнастайныя праграмы, сярод найноўшых — «Паданні маёнтка Браўды», завязаная на любоўнай гісторыі мясцовага пана. «Нашы анімацыйныя праграмы разлічаны на дзве гадзіны, людзі знаёмяцца з Сярэднявеччам, традыцыямі і легендамі, спрабуюць сябе ў ролі рыцараў, развучваюць старадаўнія танцы, прымяраюць даспехі. Акрамя таго, на тэрыторыі комплексу ёсць вяровачны парк «Форт Баярд», трэнажорная зала, аказваюцца медыцынскія паслугі», — падзяліўся **дырэктар унітарнага прадпрыемства турысцка-аздараўленчага комплексу «Орша» Раман ШТЫРХУНОЎ.**

Кажуць, некалі на беразе Лосвіда жыў пан, які забаўляўся тым, што па першым лёдзе на санях вёз гасцей па возеры. Але ён ведаў, што насамрэч на другі бераг можна перабрацца па патайной сцежцы. Праходзілі тут і французы — па адной з легендаў, быццам бы ў гэтых мясцінах схаваныя скарбы Напалеона. Перайсці цераз возера па падводнай дарозе, а таксама пашукаць скарб прапануе **работнік унітарнага прадпрыемства «Віцебсктурыст» Аляксандр КАВАЛЁЎ, ён жа «пан Анісім».** І хоць возера Лосвіда лічыцца адным з самых глыбокіх на Віцебшчыне, на незвычайнай сцежцы, што пракладзена цераз яго, глыбіня не больш за паўметра.

Архіўныя матэрыялы, якія расказваюць пра сярэднявечныя аптэкарскія сады, аказаліся запатрабаванымі пры падборы калекцый і планіроўкі новага экскурсійнага аб'екта на Мядзельшчыне — аптэкарскага саду. На яго тэрыторыі ёсць і ўнікальная хатка бабулі-траўніцы. Наведаць сад можна з красавіка да лістапада, тут так падабраны кампазіцыі, каб заўсёды былі квітнеючыя расліны. Адна з іх — марознік — можа распусціцца яшчэ ў сакавіку, а пры цёплай зіме нават у лютым. Тых, хто выбіраецца сюды ў маі, чакае прыемны сюрпрыз — квітнее алея сакуры. Наогул, тут можна пабачыць каля 200 відаў раслін, якія выкарыстоўваліся ў народнай медыцыне, у тым ліку і вельмі рэдкія. На экскурсіі вы адкрыеце многія сакрэты зёлак, зможаце дакрануцца да іх, сарваць, расцерці, адчуць асаблівы водар і, канешне, пачастуецеся смачнай і карыснай гарбатай.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Такі можа быць смак турызму.

■ Бязвіз

ВАРОТЫ АДКРЫТЫ. А ШТО ЗА ІМІ?

Як рэгіянальныя СМІ могуць прывабіць замежнага турыста

Напрыканцы 2017-га тэрмін бязвізавага знаходжання замежных грамадзян у асобных раёнах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, у адпаведнасці з указам Прэзідэнта, працягнулі да 10 дзён, а таксама павялічылі колькасць пунктаў пропуску для бязвізавага ўезду. Якім эканамічным эфектам гэта адгукнецца? Што для прываблівання замежных турыстаў могуць зрабіць рэгіянальныя друкаваныя выданні, інтэрнэт-парталы, радыё і тэлебачанне? Пра гэта ішла гутарка падчас круглага стала «Патэнцыял СМІ Брэстчыны ў прасоўванні турыстычнага бізнесу».

Нагадаем, акрамя магчымасці скарыстаць дзеючы з першай паловы мінулага года дазвол на пяцідзённы бязвізавы ўезд у Беларусь праз Нацыянальны аэрапорт, турысты маглі трапляць без дадатковых дакументаў таксама на Аўгустоўскі канал (на тэрмін да 5 сутак) і ў Белавежскую пушчу (на тэрмін да 3 сутак). Новым указам акрамя павелічэння тэрміну бязвізавага знаходжання таксама пашыраны і тэрыторыі для часовага знаходжання замежных турыстаў. Напрыклад, наведвальнікам Аўгустоўскага канала дазволяць пабываць у Гродне і Гродзенскім раёне, а з Белавежскай пушчы з'ездзіць у Брэст, а таксама Брэсцкі, Жабінкаўскі, Камянецкі, Пружанскі і Свіслацкі раёны.

Па словах **Вадзіма ЛЯЎКОВІЧА, першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама,** экспарт турыстычных паслуг па вобласці за мінулы год склаў 12,1 мільёна долараў. «Па папярэдніх планах, з увядзеннем бязвізавага рэжыму гэту лічбу плануецца павялічыць да 13 мільёнаў долараў», — адзначыў ён. На думку Вадзіма Ляўковіча, бязвіз — гэта безумоўны эканамічны патэнцыял, але падмацоўваць яго трэба развіццём аграэкатурызму, інфраструктуры, стварэннем новых працоўных месцаў, такім чынам робячы акцэнт і на іміджавы складнік.

Брэсцкія СМІ таксама ўжо даўно рыхтуюцца да падзеі, якая мусіць ажывіць турыстычную сферу краіны, — II Еўрапейскіх гульняў 2019 года. «У Брэсце ўжо распрацоўваецца «карта госця», а таксама спецыяльны турыстычны сайт», — расказвае **галоўны рэдактар брэсцкай абласной газеты «Заря» Аляксандр ЛАГВІНОВІЧ.** Па яго словах, работу па інфармаванні замежнікаў аб магчымасцях Беларусі ў плане вандровак, а тым больш бязвізавага ўезду, варта актывізаваць ужо зараз. На думку галоўнага рэдактара, трэба развіваць не толькі замежны, але і ўнутраны турызм. Акурат у гэтым рэгіянальныя СМІ могуць адыграць адну з галоўных роляў, расказваючы пра славутасці роднай зямлі.

Некаторыя газеты не чакаюць змен да лепшага з боку дзяржавы, а здзяйсняюць іх самі. Цэлы турыстычны рух разгарнуўся на базе «Навін Камянеччыны». Як расказаў **галоўны рэдактар газеты Віктар ДУЛЕВІЧ,** на базе выдання выйшаў тэлефонны даведнік турыстычных аб'ектаў Камянца, працуюць цэнтр аператыўнай паліграфіі, фотаклуб, праводзіўся семінар па посткросінгу, што стала нагодай для стварэння новых паштовак з прыгожымі мясцінамі горада, распрацаваны турыстычны сайт і перакладзены на некалькі замежных моў. А для таго, каб зрабіць Каменец больш адаптаваным для замежных турыстаў, плануецца праводзіць курсы англійскай мовы для супрацоўнікаў сферы абслугоўвання.

Досведам у тым, як можна выкарыстаць магчымасці бязвізу, падзяліўся і **Павел СУХАРУКАЎ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда».** Напрыклад, можна выдаваць рэкламны каталог, турыстычны каляндар, распрацаваць адпаведны сайт. Увогуле ўвядзенне такіх нормаў, як павелічэнне тэрміну бязвізавага знаходжання замежнікаў, можа стаць магчымасцю для фінансавага росту выдання. Але прапановы Паўла Сухарукава датычыліся не толькі СМІ, але і развіцця турызму ў прынцыпе. На яго думку, варта больш актыўна ўкладацца ў развіццё інфраструктуры і арыентавацца на такую мэтавую аўдыторыю, як турысты «з заплечнікамі», якія шукаюць магчымасць танна і каларытна адпачыць.

«Напрыклад, за час дзеяння бязвізавага 5-дзённага ўезду на Аўгустоўскі канал у Гродне сталі актыўна з'яўляцца хостэлы — танны, даступны для кожнага варыянт бюджэтнага начлегу. Але іх пакуль не так шмат і тым больш няма ў малых гарадах. Гэта датычыцца не толькі гасцініц. Увогуле варта працаваць па ўсіх кірунках развіцця інфраструктуры, рабіць яе якаснай і даступнай не толькі высокаму сегменту турыстаў, але і сярэдняму і ніжняму, — дзеліцца галоўны рэдактар. — Галоўнае, памятаць, што турыстычная сфера патрабуе не перманентнай, а штодзённай руплівай працы і новых жыццяздольных ідэй».

Вераніка ПУСТАВІТ